# РЭГІЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯК САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫ ІНСТЫТУТ (на прыкладзе Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея)

**А. А. Трусаў,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У савецкія часы гісторыя Беларусі шмат разоў перапісвалася, скажалася, а гісторыкі ў сваіх працах «вагаліся з лініяй партыі» ад сталінізму да гарбачоўскай перабудовы. Іх не заўсёды цікавілі жыццё, біяграфіі і радаводы простых людзей. Баючыся рэпрэсій, людзі знішчалі сямейныя архівы, не вялі асабістых дзённікаў, не расказвалі дзецям і ўнукам пра свой радавод. Тым не менш у большасці сем'яў захаваліся старыя фотаздымкі, лісты, некаторыя гістарычныя дакументы, узнагароды і інш. Таму вельмі важна сабраць іх і пры магчымасці надрукаваць разам з асабістымі ўспамінамі. Менавіта гэтыя рэчы, якія могуць стаць музейнымі артэфактамі, надаюць канкрэтны сэнс патрыятычнаму выхаванню моладзі, выклікаюць у іх павагу і гонар за сваіх продкаў, якія на працягу мінулага XX ст. збудавалі новую, незалежную Беларусь.

І ў гэтым вялікая роля рэгіянальных музеяў. Менавіта рэгіянальныя музеі з'яўляюцца часткаю мясцовага сацыяльна-культурнага асяроддзя, дзе ажыццяўляецца актыўны дыялог з насельніцтвам, выкарыстоўваюцца не толькі традыцыйныя, але і сучасныя сродкі музейнай культурна- патрыятычнай работы.

Сучасная музеялогія разглядае музей як сацыяльна-культурны інстытут, які займае сваю нішу ў сацыякультурным асяроддзі, прычым патрыятычнае выхаванне моладзі – адзін з галоўных кірункаў яго культурна-адукацыйнай дзейнасці.

Зараз прадугледжваецца актыўны ўдзел наведвальнікаў у музейных мерапрыемствах. У гэтым працэсе выкарыстоўваюцца і традыцыйныя сродкі музейнай дзейнасці з увядзеннем сучасных (тэатралізаваных і інтэрактыўных) гульнявых мадэлей [1].

У якасці прыкладу разгледзім дзейнасць Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея, дзе актыўна спалучаюцца трады-

цыйныя сродкі культурна-асветніцкай дзейнасці з інтэрактыўнымі мадэлямі трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны.

Шмат гадоў мсціслаўская інтэлігенцыя выступала за тое, каб у горадзе адкрыць дзяржаўны музей. Пасля працяглых намаганняў грамадскасці паводле ўказа Міністэрства культуры БССР ад 30 сакавіка 1988 г. быў створаны Мсціслаўскі раённы гісторыка-археалагічны музей. Спачатку ён размяшчаўся ў прыбудове да былога кармяліцкага касцёла. Узначаліў яго малады тады гісторык С. Клімаў, зараз дырэктар Нясвіжскага музея-запаведніка. С. Клімаў здолеў аб’яднаць вакол сябе мясцовых школьнікаў, якія дапамагалі папаўняць музейныя фонды цікавымі знаходкамі. Частку археалагічных знаходак, знойдзеных падчас раскопак гістарычнага цэнтра Мсціслава і Тупічэўскага манастыра, перадаў у музей і аўтар гэтага артыкула.

У маі 1995 г. музей пераехаў на сталае месца ў будынак былой павятовай пошты канца XIX ст. У 2008 г. у фондах музея налічвалася больш за 12 тысяч прадметаў асноўнага фонду і 18 тысяч – навукова-дапаможнага. Агульная плошча экспазіцыі складала 265 м².

У археалагічнай экспазіцыі «Мсціслаў – імя старажытнае» змяшчаюцца археалагічныя знаходкі з раскопак Мсціслаўскага замчышча, пасада і акольнага горада. У экспазіцыі «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Мсціслава ў XII–XX стст.» прадстаўлены калекцыі кафлі XVI–XVIII стст., кавальскія вырабы. Увагу наведвальнікаў музея прыцягваюць калекцыя «Жывапіс», а таксама музейны куток «Этнаграфія і быт», дзе галоўнае месца займае ткацкі станок. У 2009 г. з’явіліся новыя элементы новай экспазіцыі «Куток Пятра Мсціслаўца», «Швейная майстэрня».

Адным з цікавых момантаў патрыятычнага выхавання з актыўным удзелам супрацоўнікаў музея з’яўляюцца тэатралізаваныя штогадовыя святы сярэднявечнай культуры.

Фэст сярэднявечнай культуры нарадзіўся ў Мсціславе пяць гадоў таму назад, калі старшыня райвыканкама запрасіў клуб ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Магілёўская дружына» паўдзельнічаць у Дні горада. 12 чалавек (сяброў клуба) прынялі ўдзел у гэтым свяце. Так адбылося першае на ўсходзе Беларусі свята з удзелам рыцараў. Поспех быў незвычайны. З тых часоў «Мсціслаўскі фэст» стаў брэндам. Крамы горада турысты бяруць прыступамі, дзверы музея не зачыняюцца, майстры народных промыслаў за 2–3 дні збываюць усе свае вырабы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Рыцарскі фэст – 2010» прайшоў 24–25 ліпеня з асаблівым размахам. Месцамі правядзення сталі гарадскі цэнтр Мсціслава, старыя муры езуіцкага калегіума і кляштара і, вядома, Замкавая гара. Акрамя рыцарскіх забаў, у праграму былі ўключаны канцэрты гуртоў «Стары Ольса», «Яварына», «Песняры». На Замкавай гары быў урачыста адкрыты памятны знак мсціслаўскаму князю Сямёну Лунгвену, намесніку Вітаўта ў Грунвальдскай бітве.

15 ліпеня на Мсціслаўскім паштамце было зроблена спецгашэнне адмысловай маркі «600-годдзе перамогі над Грунвальдам», прысвечанай памяці Сямёна Лунгвена.

У 2011 г. у ліпені падчас «Рыцырскага фэсту. Мсціслаў – 2011» за межамі музея праводзілася выстава «Новыя старонкі сівой даўніны», якую наведалі каля 2 тысяч жыхароў і гасцей раёна.

Падчас свята «Дзень горада», якое адбылося 23–24 верасня 2011 г., былі адкрыты новыя музейныя экспазіцыі – «Знакамітыя землякі» і «Яўрэі ў гісторыі Мсціслава». У гэтыя дні па-за межамі музея працавала выстава «Архітэктура Беларусі».

У мінулым годзе 28–29 ліпеня ў Мсціславе ў пяты раз прайшоў фестываль сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст. Мсціслаў – 2012».

Самому фэсту папярэднічала навуковая канферэнцыя, прысвечаная слыннаму мсціслаўцу Міхасю Ткачову. На канферэнцыі выступалі навукоўцы з Мінска і Магілёва. Вялікая ўвага нададзена гістарычнаму мінуламу Мсціслаўшчыны ад палеаліту да нашых дзён. Мсціслаўская газета «Святло Кастрычніка» прысвяціла Міхасю Ткачову цэлую паласу.

Традыцыйна асноўныя дзеі фестывалю – рыцарскія турніры і канцэрты сярэдневяковай музыкі, як і ў мінулыя гады, праходзілі на Замкавай гары. Урачыстае адкрыццё фэсту адбылося на цэнтральнай плошчы старога горада ля помніка Пятру Мсціслаўцу.

На Замкавай гары і раскінулі свае намёты ўдзельнікі фестывалю. У ім вырашылі ўдзельнічаць больш за сорак рыцарскіх клубаў. З'язджацца ў Мсціслаў яны пачалі яшчэ загадзя. Прыехалі рыцары ўсёй старажытнай Смаленскай зямлі ад Вязьмы да Дарагабужжа і да беларускай яе часткі, рыцары з Эстоніі, Украіны, але наймацней была рэпрэзентавана сама Беларусь.

Для ахвочых навучыцца сярэднявечным танцам праводзіліся майстар-класы. Два дні праходзілі канцэрты гуртоў, якія выконвалі сярэднявечную музыку. Завяршыўся фестываль з намерам –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сабрацца тут праз год. Мсціслаўскі рыцарскі фэст набыў статус абласнога мерапрыемства.

Вялікая роля музея ў арганізацыі розных культурных падзей у рэгіёне.

Так, у 2001 г. у Мсціславе адбыўся Міжнародны пленэр па жывапісе «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве». Творы ўдзельнікаў пленэра папоўнілі музейную калекцыю.

У 2011 г. у горадзе прайшоў чарговы міжнародны пленэр мастакоў. З яго нагоды ў музеі была адкрыта мемарыяльная шыльда ў гонар Андрыяна Прахава, знакамітага гісторыка мастацтва, археолага і мастацкага крытыка, які паходзіць з Мсціслава.

Музычная школа горада, што носіць імя кампазітара М. Чуркіна, які пэўны час жыў у Мсціславе, рэгулярна ладзіць розныя музыкальныя імпрэзы. Супрацоўнікі музея прынялі актыўны ўдзел у правядзенні рэспубліканскага фестывалю камернай музыкі імя М. Чуркіна. Таксама створаны міні-музеі (музейныя пакоі) у аграгарадках Мсціслаўшчыны – Падлушшы, Сяльцы і Андранах.

Музейнымі супрацоўнікамі распрацаваны наступныя турыстычныя маршруты: «Пустынскі Успенскі мужчынскі манастыр», «Архітэктурныя помнікі Мсціслава», «Мой родны кут – мой горад Мсціслаў», «Помнікі археалогіі: Дзявочая і Замкавая горы».

Дзякуючы турызму колькасць наведвальнікаў музея значна павялічылася. Калі ў 2006 г. музей і горад наведалі больш за 5000 чалавек, то ў 2010 г. – 14 315 чалавек, з іх 11 366 – турысты-экскурсанты.

Цікавыя літаратурныя імпрэзы адбываюцца з нагоды юбілеяў пісьменнікаў, лёс якіх цесна звязаны з Мсціслаўшчынай. Гэта Максім Гарэцкі, Аркадзь Куляшоў, Эрнест Ялугін і інш.

Трэба сказаць, што ў Мсціслаўскім раёне існуе яшчэ адзін дзяржаўны музей. Гэта Літаратурны музей М. Гарэцкага ў в. Малая Багацькаўка – малой радзіме класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага. Ідэю стварыць такі музей да стагоддзя з дня нараджэння М. Гарэцкага ўпершыню выказаў У. Караткевіч, маці якога паходзіць з Мсціслава. Таму У. Караткевіч прысвяціў Мсціславу асобную працу, у якой ён захоплена апавядаў пра ўнікальную гісторыю Мсціслаўшчыны.

Праз трыццаць гадоў пасля наведвання У. Караткевічам Мсціслава з мэтай напісання сваёй кнігі вандроўку па помніках Мсціслаўшчыны паўтарылі пісьменніца Людміла Рублеўская і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторык, а таксама вядомы калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў. Свае ўражанні ад вандроўкі яны выклалі на старонках газеты «СБ Беларусь сегодня» [3].

На месцы былога падворка сям’і Гарэцкіх была адноўлена хата паводле старых фотаздымкаў, зроблена адпаведная экспазіцыя. Апошні раз экспазіцыя, асабліва яе літаратурная частка, была адноўлена ў 2008 г.

28 снежня 2010 г. Літаратурны музей М. Гарэцкага перададзены Мсціслаўскаму раённаму аддзелу культуры, і ён стаў філіялам Мсціслаўскага раённага гісторыка-археалагічнага музея.

Супрацоўнікі музея папулярызуюць беларускую мову сярод насельніцтва і гасцей горада і раёна, беручы прыклад са свайго знакамітага пісьменніка-земляка. Праводзяляцца экскурсіі на беларускай мове, па-беларуску афармляюцца выставы з мэтай папулярызацыі вытокаў народнай творчасці, традыцыйнага мастацтва і гісторыка-культурнай спадчыны. Адбыліся сустрэчы з мсціслаўскай паэткай Н. Карнеевай і старшынёй гарадской арганізацыі ТБМ г. Магілёва.

7 лістапада 2012 г. у музеі М. Гарэцкага адбылася талака, праведзеная сябрамі ТБМ, якія прыехалі з Магілёва. Разам з супрацоўнікамі музея яны пасадзілі ружы ў кветніку каля хаты Гарэцкіх і адрамантавалі памятны знак. Удзельнікі талакі таксама наведалі мясцовыя могілкі, дзе пахаваны бацькі М. Гарэцкага.

Паводле дадзеных на 01.10.2011 г. за 9 месяцаў было праведзена 175 экскурсій (12 186 наведвальнікаў музея), а колькасць платных паслуг дасягнула 13 418 500 рублёў. Назіраецца дынаміка росту цікаўнасці наведвальнікаў да культурна-гістарычнай і прыроднай спадчыны Мсціслаўшчыны. Гэта станоўча характарызуе музей у галіне турыстычнай дзейнасці і патрыятычнага выхавання. Як лічыць доктар гістарычных навук Аляксандр Гужалоўскі, «музей – гэта не толькі сховішча гісторыка-культурнай спадчыны, але і пляцоўка, дзе адбываюцца камунікацыйныя працэсы. Адна са складаючых яго місіі фармулюецца як развіццё асобы чалавека спецыфічнымі сродкамі» [2]. Адным з такіх дзейсных сродкаў і з’яўляецца патрыятычнае выхаванне.

---

*1. Бяспалая, М.А.* Рэгіянальныя музеі Беларусі : сутнасць, стан і перспектывы развіцця / М.А. Бяспалая // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2012. – № 1. – С. 138.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Гужалоўскі, А.А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.
3. *Рублевская, Л.* Руины тридцать лет спустя / Л. Рублевская // СБ Беларусь сегодня. – 2012. – 17 авг. (№ 153).
4. *Трусаў, А.А.* Роля гісторыка-культурнай спадчыны ў фарміраванні беларускай ментальнасці // Наша слова. – 2011. – 5 крас. (№ 40).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ